Источник: **«Звязда» - 2012-12-22**

# Прэзентацыя кнігі ў тэатральнай атмасферы

**У Мінску прадставілі невядомыя старонкі тэатральнай гісторыі Беларусі: у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі адбылася прэзентацыя манаграфіі польскага тэатразнаўца Збігнева Ендрыхоўскага "Гродзенскія тэатры 1784—1864".**

Як адзначылі падчас імпрэзы, гэтая кніга не толькі пра Гродна, не толькі пра тэатры, і не толькі пра XIX стагоддзе. На пяцістах старонках аўтар сабраў каштоўныя матэрыялы, у тым ліку і тыя, што раней не публікаваліся, з архіваў і бібліятэк Польшчы, Беларусі, Расіі і Літвы. У кнізе падаюцца звесткі пра развіццё тэатра на Беларусі, у прыватнасці, распавядаецца пра дзейнасць польскіх тэатраў у азначаны васьмідзесяцігадовы перыяд. Манаграфія змяшчае афішы, дакументы, поўны рэпертуар тэатраў Гродзеншчыны, паштоўкі і рэдкія фотаздымкі, а таксама жыццяпісы папулярных у тыя часы артыстаў ды прыгоды падчас гастроляў. Даследаванне, што ўяўляе сабой у першую чаргу навуковы твор, напісана жывой мастацкай мовай і будзе цікавым аматарам тэатральнага мастацтва, гісторыкам, музыкантам і архітэктарам.

Сама прэзентацыя кнігі праходзіла ў тэатральнай атмасферы: гледачоў у залу запрасілі трыма званкамі, гучала жывая музыка, а аўтар, кандыдат гуманістычных навук Збігнеў Ендрыхоўскі, страціўшы ад хвалявання голас, па-акцёрску эмацыянальна распавядаў пра свой твор.

Дэкарацыяй да мерапрыемства стала выстаўка "З гісторыі тэатральнага жыцця Беларусі", спецыяльна падрыхтаваная супрацоўнікамі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў. На ёй прадстаўлена больш за сто рукапісных і друкаваных дакументаў XVIII—XXI стст. з фондаў бібліятэкі, прысвечаных сцэнічнаму мастацтву. Найстарэйшы дакумент у экспазіцыі датаваны 1778 годам — праграма "Сялянскага балета" ў пастаноўцы Гродзенскага тэатра, які належаў вядомаму палітычнаму і грамадскаму дзеячу Вялікага Княства Літоўскага Антону Тызенгаўзу. Таксама на паліцах — прыжыццёвыя выданні папулярных у свой час сцэнічных твораў: "Сялянка" (Вільня, 1846) пачынальніка беларускай прафесійнай драматургіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, "Хатка ў лесе" (Вільня, 1855), "Каспер Карлінскі" (Вільня, 1858) паэта і драматурга Уладзіслава Сыракомлі. Асобныя экспанаты захавалі на сваіх старонках пячаткі і рукапісныя запісы знакамітых асоб, у тым ліку пісьменнікаў Элізы Ажэшкі і Максіма Гарэцкага.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**